разить одномерной категоричной формулировкой. Несомненно лишь то, что оно нередко уводило человека от заземленности, приниженности интересов и чаяний, спасало от бездуховности, побуждало думать о вопросах бытия. То же можно сказать о деятельности подвижников веры: они демонстрировали возможности человеческого духа в обуздании страстей, подчинении своей жизни великой цели. Они внесли заметный вклад в раскрытие многих глубинных сторон жизни, ее противоречий. Они доносили до людей христианские таинства и праздничные обряды (исповедь, обеты, родительские дни и т.д.), которые имеют нравственное значение. Они же, стараясь просветить целые народы, несли свой опыт, успокаивали и утешали страждущих.

И конечно же, главные уроки христианства – это вера, надежда, любовь и мир. Без них невозможны современная культура, весь наш мир.

**М.А.Бяспалая**, дацэнт
Беларускага універсітэта культуры

## ПАЛІТЫЧНАЕ АСВЕТНІЦТВА 20-Х ГАДОЎ У БЕЛАРУСКАЙ ВЁСЦЫ ЯК АДЫХОД АД АСВЕТНІЦКІХ ТРАДЫЦЫЙ СЛАВЯНСТВА

Праблема, вынесеная ў загаловак, не такая адназначна выразная, як падаецца на першы погляд. Прасцей за ўсё было б прызнаць відавочны разрыў палітычнага асветніцтва 20-х гадоў з асветніцкімі традыцыямі славянства. Аднак пры больш дакладным аналізе духоўнага жыцця савецкага грамадства ў азначаны перыяд узнікае шмат пытанняў, якія немагчыма растлумачыць толькі параўнаннем характэрных рыс аднаго і другога асветніцкага накірунку.

Перш за ўсё неабходна ўлічваць, што традыцыйнае славянскае асветніцтва грунтавалася на хрысціянскай філасофіі і маралі, якія надавалі галоўную каштоўнасць чалавеку незалежна ад яго месца ў грамадстве. Хрысціянскае асветніцтва замацоўвала ў грамадстве разуменне дабра і зла, роўнасці ўсіх перад Богам, спагады да слабых, павагі да старэйшых. Палітычнае асветніцтва, якое з'яўлялася часткай новай, савецкай культуры, у аснову дзейнасці паклала класавы прынцып. Усе падзеі грамадскага жыцця разглядаліся праз прызму класавых інтарэсаў пралетарыяту, у імя дасягнення якіх можна было перакрэсліваць шматвяковыя народныя традыцыі, хрысціянскія нормы маралі і запаведзі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Вядома, што творцы культурнай праграмы бальшавіцкай партыі ігнаравалі відавочны факт адначасовага неантаганістычнага суіснавання, узаемадзеяння і ўзаемапранікнення розных плыняў у кожнай нацыянальнай культуры, а тым самым яе адзінства і цэласнасці. Наадварот, актыўна прапагандавалася думка аб наяўнасці ў культуры любой нацыі дэмакратычных элементаў, якія, само сабою зразумела, развіваў пралетарыят. У той жа час прызнавалася галоўная роля буржуазіі ў фарміраванні нацыянальнай культуры. Зыходзячы з гэтага, У.І.Ленін і іншыя тэарэтыкі культурнай праграмы савецкай улады лічылі неабходным стварэнне новай, адметнай ад існуючай, пралетарскай культуры, якая б адлюстроўвала навакольную рэчаіснасць з пункту гледжання класавых інтарэсаў пралетарыяту.

На падставе вышэйсказанага, нам падаецца, можна зрабіць выснову, што для кіруючай партыі галоўным стала пашырыць культуру "пралетарскую па змесце і нацыянальную па форме" сярод усіх нацый і народнасцей былой Расійскай імперыі. Месца вялікадзяржаўнай ідэалагічнай трыяды царызму – праваслаўе, народнасць і самадзяржаўе – павінны былі заняць новыя савецкія міфы: аб ліквідацыі эксплуатацыі чалавека чалавекам, аб дзяржаве рабочых і сялян, аб выключнай ролі Камуністычнай партыі і інш. У новай прапагандысцкай сістэме і ідэалагічнай праграме нівеліраваліся агульначалавечыя і традыцыйныя маральныя і этычныя каштоўнасці, якія ствараліся стагоддзямі і на аснове якіх развіваліся нацыянальныя культуры. Спрадвечныя народныя звычаі, нормы паводзін падпадалі пад намаганні савецкай улады выхаваць грамадзян у камуністычным прасавецкім настроі.

Рэвалюцыя прынесла новыя погляды на навакольны свет і аб'явіла аб планах яго перабудовы. Рэвалюцыйны энтузіязм, які ахапіў многіх, асабліва ў кіруючых эшалонах улады, не даваў магчымасці рэальна ацаніць сітуацыю. Напрыклад, Гомельскі аддзел асветы 24 красавіка 1920 г., у час наступлення белапалякаў, прапанаваў "праводзіць канцэрты, мітынгі, даклады аб перажываемым моманце, штодзённа праводзіць гутаркі і, па магчымасці, канцэрты". Безумоўна, вельмі добра было б, каб падобнымі сродкамі можна было спыніць ваенныя дзеянні, але прапануемая праграма адлюстроўвае, на наш погляд, толькі ілюзорнае ўяўленне аб рэчаіснасці.

Найбольш сур'ёзнай перашкодай на шляху новай культуры магла стаць царква з яе шматвяковымі духоўнымі традыцыямі і вялікім аўтарытэтам сярод насельніцтва. Таму яе дзейнасць пачынае абмяжоўвацца шляхам прыняцця ўсемагчымых рашэнняў па

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

эканамічным становішчы царквы і разгортванні антырэлігійнай прапаганды. Наколькі савецкая ўлада разумела ролю царквы ў тагачасным грамадстве, на наш погляд, даволі выразна паказвае выступленне аднаго з кіраўнікоў рэспубліканскага палітасвета перад нізавымі работнікамі аб неабходнасці ператварыць хаты-чытальні ў своеасаблівыя цэрквы, а хатнікаў – у “чырвоных папоў”.

Афіцыйныя палітыка-асветныя ўстановы, якія на Беларусі пачалі ствараца ў канцы 1920 г., не карысталіся павагаю сялянства. Напрыклад, у справаздачы Каралішчавіцкай хаты-чытальні Мінскага раёна гаварылася: “Цяжка вывесці п’янства, бо назіраецца з’яўленне п’яных у чытальні з пагрозамі і вульгарнымі выразамі”. З Лошыцы пісалі: “Наведвальнікі вядуць сябе нетактоўна, парушаюць цішыню, пры пастаноўцы спектакляў кураць і размаўляюць”. Безумоўна, можна спасылацца на адсутнасць агульнай культуры ў сельскіх гледачоў, аднак жа ў царкве ніхто не паводзіў сябе такім чынам. Новая культура і яе ўстановы не змаглі заняць месца спрадвечнага духоўнага цэнтра – царквы, а яе работнікі не сталі “чырвонымі папамі”.

Не зусім зразумелымі для вяскоўцаў аказаліся формы і метады новай культуры: мітынгі, мітынгі-канцэрты, мітынгі-спектаклі, харавая дэкламацыя, “жывыя карцінкі”, лекцыі, гутаркі і інш. Падобнымі мерапрыемствамі ўлады спрабавалі выцесніць народныя святы з іх адшліфаваным стагоддзямі рытуалам, казкі, паданні, прымаўкі, якія засталіся ад прашчураў і фарміравалі сялянскую ментальнасць. Большасць насельніцтва, у тым ліку навуг настнікі, не ўспрымалі лозунгаў, заклікаў і галоўных ідэалагічныя штампаў новай улады. У якасці ілюстрацыі спашлемся на цікавыя, з нашага пункту гледжання, вытрымкі з дакументаў, якія тычацца пазіцыі настаўнікаў. Некаторыя іх учынкі, напрыклад, вывешванне лозунга “Хай жыве наш правадыр Якуб Колас!”, сталі аб’ектам крытыкі на самым высокім узроўні. Аб іншых выпадках як “аб элементарнай палітычнай непісьменнасці” паведамляў часопіс “Асвета”. Настаўніца адной вясковай школы ў дзень 10-годдзя Кастрычніцкай рэвалюцыі вывесіла ў школе лозунг “Няхай жыве міжнародная сацыял-дэмакратыя”. Пры з’яўленні ў класе інспектара другая настаўніца загадала дзецям устаць і заспяваць “Ад веку мы спалі і нас разбудзілі”.

Неабходна звярнуць увагу, што ва ўсе стагоддзі носьбітамі асветы і культуры з’яўляліся самыя адукаваныя і таленавітыя людзі. Звесткі аб іх жыццёвым шляху і духоўным подзвігу перадаюцца з пакалення ў пакаленне і складаюць адну з самых цікавых старонак гісторыі. Аднак рэвалюцыя выклікала да жыцця зусім адметных



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

носьбітаў культуры – не вельмі адукаваных і нават малапісьменных, але поўнасцю адданых рэвалюцыі. Справа ўскладнялася тым, што нават і такіх кадраў не хапала. У адным з дакументаў гаварылася: "Калі мы і зараз запытаем сябе, што перашкодзіла і перашкаджае да сённяшняга часу рэальна правесці арганізацыю камуністычнага ладу, то мы зараз жа атрымаем адказ: "Няма людзей і таму не справіліся. Што ні пачынаеш рабіць, усюды адно і тое ж – няма людзей і баста!" Прапагандыстамі партыйнай ідэалогіі стала моладзь, новае пакаленне, якое з захапленнем падтрымала прывабныя заклікі. Ідэалагічная рэвалюцыя закранула амаль кожную сям'ю і прывяла да расколу тагачаснага грамадства на дзяцей і бацькоў, але не па ўзроставай, а па палітычнай прыкмеце. Спрадвечны канфлікт пакаленняў набывае палітычную афарбоўку.

Такім чынам, правячая Камуністычная партыя праз свае палітыка-асветныя ўстановы актыўна ўкараняла ў свядомасці грамадзян новыя прынцыпы і нормы паводзін, новыя духоўныя каштоўнасці. На працягу дзесяцігоддзяў фарміраваліся свядомасць і псіхалогія насельніцтва, якія характарызаваліся як станоўчымі, так і адметнымі рысамі, праяўляліся, праяўляюцца і, мабыць, будуць праяўляцца ў будучым.

**А.І.Смолік**, прафесар
Беларускага універсітэта культуры

## АМАТАРСКАЯ МАСТАЦКАЯ ТВОРЧАСЦЬ ЯК СРОДАК САЦЫЯЛІЗАЦЫІ АСОБЫ

Характэрнай асаблівасцю апошняй чвэрці XX ст. з'яўляецца развіццё працэсу самаарганізацыі культурнай дзейнасці. Назіраецца тэндэнцыя стварэння аматарскіх аб'яднанняў, культурных таварыстваў этнічных супольнасцей, новых устаноў клубнага тыпу. Культурнае жыццё беларускіх гарадоў і вёсак набывае новыя накірунак і змест на аснове ўдасканалення арганізацыйнай інфраструктуры ўстаноў, арганізацый і прадпрыемстваў культуры. Многія з іхператварыліся з забаўляльных устаноў у клубы, якія ставяць сваімі мэтамі далучэнне насельніцтва да розных відаў культурнай дзейнасці, задавальненне патрэб асобы ў самавыяўленні і самасцвярджэнні. Такія новыя тыпы клубных устаноў, як цэнтры рамёстваў, дамы фальклору і рамёстваў, школы народнай творчасці, аматарскія аб'яднанні, маюць добрую аснову для выкарыстання ў сваёй дзейнасці новых тэхналогій, метадаў і відаў мастацка-творчай рэабілітацыі, якія шырока распаўсюджаны ў розных краінах свету.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ